# ДЗІКАЯ ПРЫРОДА Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БЕЛАРУСІ

Аўтар: Сямен Лукашук
Фота: Уладзіміра Багданава і Сяргея Плыткевіча

6 189



24.12.2021

**23 снежня ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё фотавыстаўкі «Зялёны позірк».**

Гэта вынік працы міжнароднага праекта, ініцыяванага Гродзенскім абласным аддзяленнем грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз».

У яго межах былі праведзены фотаконкурсы ў Польшы і Беларусі. Беларускія пераможцы конкурсаў атрымалі магчымасць прыняць удзел у двух водных экспедыцыях па рэках Чорная Ганча, Асташанка і Ласасянка. Планавалася, што ўдзельнічаць у экспедыцыях будуць і польскія фатографы, але пандэмія зрабіла свае карэктывы ў праект.

Для экспазіцыі ў галерэі "Панарама" былі адабраныя здымкі, якія паказваюць Гродзенскую пушчу – прыгожыя панарамы ракі Неман і яе прытокаў, Аўгустоўскага канала, рэдкія кадры з жыцця дзікіх жывёлаў. Аўтары здымкаў Сяргей Плыткевіч, Наталля і Сяргей Марозавы, Дзмітрый Гурыновіч.



Адкрываючы выставу, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша падкрэсліў, што зараз змясціць такую выставу ў самай высокай галерэі краіны вельмі сімвалічна: людзі чакаюць навагодніх цудаў, а мы ім паказваем вельмі незвычайныя імгненні з жыцця рэдкіх звяроў і птушак.



Намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення РТСС Сяргей Каляда расказаў пра праект "Зялены позірк" і ўручыў Алесю Сушу новую кнігу "Антоні Тызенгауз і яго эпоха", якая таксама з'яўляецца вынікам міжнароднага праекта "Шляхам Тызенгауза".



Пра незвычайнасць Гродненскай пушчы і асаблівасці фотапалявання гаварыў куратар выставы знакаміты беларускі фатограф Сяргей Плыткевіч. Ён выказаў надзею, што ў многіх жыхароў Беларусі будзе магчымасць вандраваць і на свае вочы ўбачыць тую прыгажосць, якая прадстаўлена на фотаздымках.



Наталля Марозава каля сваёй працы "Рэчка Ласасянка"

Работаць выстава "Зялены позірк" будзе да 1 сакавіка 2022 года.